коммунизме. Многие идеи мыслителя впоследствии развивались бабувистами – участниками «Заговора во имя равенства» Гракха Бабёфа, но, как известно, их радикальное коммунистическое мышление не принесло реальных результатов. Ф. Энгельс даже считал Морелли создателем коммунистической теории. Во времена СССР его изучали как предшественника научного социализма.

Многие мыслители периодически возвращаются к идеям социализма и коммунизма в своих трудах. Польза подобных трактатов заключается в том, что из них можно выделить главный принцип построения идеального государства – равноправие. Однако, на наш взгляд, идея коммунизма как идеального общественного и государственного устройства неосуществима на практике. Из его положительных черт можно отметить лишь равенство, к которому человечество должно стремиться, однако, явно не путем уничтожения частной собственности и забвения самого понятия личности. В обществе, описанном Морелли и другими сторонниками подобных взглядов, не может быть истинной свободы. По своей сущности коммунизм – диктатура, которая ни к чему хорошему, как показывает история, не приводит.

Стоит согласиться с точкой зрения Л. С. Мамута: «Морелли описал в понятиях своего времени коммунистическое устройство общества. Не его вина, что в итоге получился колоритный образ казарменного коммунизма. Действительная история подтвердила достоверность как раз этого образа. Коммунизма в каком-либо ином обличье она человеческой цивилизации предъявить не смогла» [2, с. 398].

Список литературы

1. Полянский, Ф. Я. Уравнительный коммунизм Мелье, Морелли и Мабли / Ф. Я. Полянский // Всемирная история экономической мысли : в 6 томах ; гл. ред. В. Н. Черковец. – М. : Мысль, 1987. – Т. 1. – С. 516–519.

2. История политических и правовых учений : Учебник для вузов / Нерсесянц В. С. [и др.] ; Под общ. ред. акад. РАН, д. ю. н., проф. В. С. Нерсесянца. – 4-е изд., перераб. и доп. – М. : Норма, 2004. – 944 с.

3. Кодекс природы или истинный дух ее законов. Морелли / Пер. с фр. М. Е. Ландау ; под ред. и с коммент. Ф. Б. Шуваевой ; вступ. статья В. П. Волгина / М. Е. Ландау, Ф. Б. Шубаева, В. П. Волгина. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1956. – 300 с.

4. Марченко, М. Н. История политических и правовых учений: учеб. пособие / М. Н. Марченко, И. Ф. Мачин. – М. : Проспект, 2008. – 480 с.

http://edoc.bseu.by/

***В.С. Пляшко, В.А. Шавяленкава***
БДЭУ (Мінск)

## УПЛЫЎ РЭФАРМАЦЫІ НА ПАЛІТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ СЫМОНА БУДНАГА

З сярэдзіны XVI ст. на беларускіх землях пачынаецца актыўнае развіццё

рэфармацыйнага руху. Рэформацыя уяўляла сабою ідэалагічны наступ буржуазіі, якая набыла эканамічную моц і уладу і імкнулася ў Заходняй Еўропе да ўлады палітычнай. Але на яе шляху стаяла каталіцкая царква, якая асвячала феадальна-саслоўную структуру грамадства, рабіла яе мацнейшай. Таму Рэфармацыя абвясціла сваім галоўным прынцыпам асабістую адказнасць чалавека перад Богам без пасрэдніцтва царкоўных улад [1, с. 48].

Рэфармацыя з’яўлялася разнастайным праяўленнем крызісу каталіцкай царквы і сярэднявечнай хрысціянскай цывілізацыі, пераходу ад рэлігійнага светапогляду да юрыдычнага, змены феадальнага грамадства, якая адлюстравалася ў многіх сферах жыцця соцыуму, у тым ліку палітычнай і прававой. Рэфармацыя заклала асновы заходняй цывілізацыі і такія свецкія катэгорыі, як закон, дзяржава, улада і інш.

У перыяд рэфармацыі на беларускіх землях распаўсюджваліся розныя пратэстантыскія рухі. Найбольш знакамітым і значным прадстаўніком арыянства, на наш погляд, з’яўляецца Сымон Будны. Яго ідэі адрозніваліся разнастайным аналізам палітычных і прававых поглядаў на дзяржаўны апарат праз прызму ідэі рэлігійна-маральнага аднаўлення. Шэраг ідэй Буднага не страціў сваёй актуальнасці і зараз. Гэта і паслужыла асновай для напісання дадзенай работы.

Гістарычныя этапы беларускай дзяржаўнасці немагчыма разглядаць без перыяду Рэфармацыі, часткай якой з’яўляюцца палітычныя і прававыя ідэі Сымона Буднага, якія у сваю чаргу, значна паўплывалі на развіццё нацыянальнай ідэі, гістарычна сфармаваных традыцый у сферы дзяржаўнага будаўніцтва палітычнай і прававой сістэм грамадства. Мэтай даследавання з’яўляецца аналіз уплыву Рэфармацыі на палітычныя і прававыя погляды Сымона Буднага.

Сымон Будны (1530—1593) з’яўляўся найбольш вядомым тэарэтыкам антытрынітарыяў. Ён атрымаў філасофскую адукацыю ў Кракаўскім універсітэцэ, які скончыў са ступенню бакалаўра, а затым працягваў навучанне ў адным з заходнееўрапейскіх універсітэтаў, дзе глыбока пранікся ідэямі Рэфармацыі. Падчас вяртання на радзіму ён спачатку далучыўся да кальвініцкага руху. Пераклаў на беларускую мову і выдаў у нясвіжскай тыпаграфіі Мікалая Радзівіла-Чорнага пратэстанцкі «Катэхізіс». У сярэдзіне XVI ст. С. Будны далучыўся да больш радыкальнай плыні Рэфармацыі — антытрынітарызму ў яго памяркоўным варыянце.

Яго погляды на грамадства, дзяржаву і права выкладзены ў «Катэхізісе» і палемічным трактаце «Аб свецкай уладзе». Будны не быў праціўнікам прыватнай уласнасці, а пагаджаўся з тым, каб «кожны чалавек маёмасць сваю меў у моцы сваёй» [2, с. 85]. Ён ухваляў існуючую саслоўную сацыяльную сістэму, права шляхты валодаць маёнткамі, мець прыгонных сялян і чэлядзь нявольную. Мысляр рашуча асуджае спробы паўстання супраць прыгоннага права, адмоўна ставіцца да Сялянскай вайны ў тагачаснай Германіі (1524—1526), апраўдвае карныя дзеянні феадалаў у адносінах да паўстанцаў. Пры гэтым Будны асуджаў крайнасці феадальнага ладу, найбольш жорсткія праявы прыгоннага права, лічыў, што паслухмяныя і працавітыя халопы павінны быць вольныя. Ён

выказваўся за суіснаванне розных сацыяльных слаеў, дзе кожны слой выконвае пэўныя, вызначаныя яму гістарычным развіццём сацыяльныя функцыі.

Гаворачы пра сучасную на той момант дзяржаўную сістэму, аўтар адносіўся да яе пазітыўна, але ён лічыў, што дзяржаўная ўлада даецца ад Бога і ёй неабходна падпарадкоўвацца. «Улада – рэч добрая, неабходная і карысная, — пісаў Будны. — Трэба задавальняцца тым прадстаўніком улады, якога бог даў гэтай краіне» [1, с. 53]. Сапраўдны хрысціянін, на думку С. Буднага, не павінен ухіляцца ад палітычнай дзейнасці, а наадварот, прымаць у ёй актыўны ўдзел: займаць любыя дзяржаўныя пасады, звяртацца ў суд, весці судовыя працэсы, і нават выконваць абавязкі суддзі, паколькі ўсё гэта не супярэчыць евангельскаму вучэнню.

Будны бачыў шмат парушэнняў закона і слова Божага яе прадстаўнікамі, пры гэтым рабіў выснову, што асобныя несправядлівасці не вынікаюць з сутнасці самой улады, у іх вінаваты асобныя дзяржаўцы, якіх трэба караць за іх злачынствы. Будны падкрэсліваў толькі, што ваяводы, старасты і суддзі «павінны быць богабаязненымі, справядлівымі, праўдзівымі і чэснымі. Суддзі павінны судзіць справядліва, не перакручваць законы, не павінны глядзець на твары, не браць хабару, таму што падарункі асляпляюць вочы мудрых і скажаюць словы справядлівых» [2, с. 85].

Палітычным ідэалам аўтара з’яўляецца асветніцкая манархія. Разважаючы аб асобе ідэальнага манарха, Будны ў сваім творы «Аб свецкай уладзе» супастаўляе хрысціянскага адукаванага гаспадара з манархам язычніцкім, жорсткім тыранам і дэспатам. Хрысціянскі манарх павінен абараняць грамадства і імкнуцца да задавальнення патрэб усіх грамадзян, кантраляваць выкананне правасуддзя, быць справядлівым, добрым, мудрым, усебакова адукаваным.

Сымон Будны з’яўляўся антытрынітарыем, што абумовіла яго ідэі рэлігійнай верацярпімасці, свабоды веравызнання, богаўстаноўленнасці улады. У тым ліку ён выказваў трансфармаваныя ідэі, напрыклад ідэю роўнасці ўсіх людзей перад Богам, якая паступова трансфармавалася ў ідэю роўнасці ўсіх людзей перад законам. Таксама ён з’яўляўся выразнікам інтарэсаў прыгнечаных слаёў насельніцтва, адлюстроўваў іх запыты і прадстаўляў сабой тую сілу, з якой правячыя вярхі Княства не маглі не лічыцца і да якой не маглі не прыслухоўвацца. Такі ўплыў знаходзіў сваё адлюстраванне ў нормах Статута ВКЛ 1588 г. [4, с. 131].

Будны шмат увагі ўдзяліў праблеме вайны і міру. Мысляр дзяліў войны на справядлівыя і несправядлівыя. Справядлівымі прызнаваў войны абарончыя, якія ўзнікаюць з-за неабходнасці аховы цэласнасці краіны. Абараняльны бок пры такіх войнах павінен быў любымі сіламі гарантаваць бяспеку свайго народа. Сапраўдны хрысціянін павінен прымаць удзел у такой вайне.

Але часам вайна бывае несправядлівая, калі «тыран або мучыцель какой гордый... чужыя гарады, княствы або землі забіраеть» [3, с. 74]. Несправядлівыя войны дзеяч прыраўноўваў да разбою, паколькі іх мэтай быў захоп чужых тэрыторый.

Магчыма зрабіць наступныя вынікі. Сымон Будны, будучы рэфарматарам-

антытрынітарыем, заклаў шмат ідэй перыяду Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім. У той жа час рэфармацыйныя ідэі наклалі істотны адбітак на палітыка-прававыя погляды мысляра. Ён пратэставаў, з аднаго боку, супраць ўсходняй дэспатыі, з дугога — быў рашучым праціўнікам заходняга рэлігійна-ідэалагічнага прымусу, выступаў за дзяржаўную незалежнасць, свабоднае развіццё беларускай культуры, інтэлектуальную і рэлігійную талерантнасць, духоўную свабоду, законапраўе.

Спіс літаратуры


1. Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычная і прававой думкі Беларусі: Дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / І. У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2004. – 272 с.
2. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск : Маладзежнае навуковае суполніцтва, 2002. – 248 с.
3. Падокшын, С. А. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI – XVII стст.: Серыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка». / С. А. Падокшын, С. Ф. Сокал. – Мінск : Права і эканоміка, 2000. – 120 с.
4. Жук, Д. С. Уплыў рэфармацыйнага руху на нормы Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. / Д. С. Жук // Статут Вялікага Княства Літоўскага, Русскага і Жамойцкага 1588 г.: да 430-годдзя выдання : зб. навук. арт. па матэрыялах канф. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Балашэнка (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2018. – С. 131—136.


http://edoc.bseu.by/

***Т.В. Прохоренко***
БГЭУ (Минск)

## ЭВТАНАЗИЯ И ОТКАЗ ОТ МЕДИЦИНСКОГО ВМЕШАТЕЛЬСТВА: РАЗГРАНИЧЕНИЕ ДЕФИНИЦИЙ

Одним из факторов, порождающих сложности в регулировании вопросов эвтаназии, является отсутствие единого подхода к терминологии, связанной с медицинским прерыванием жизни. Учитывая высокую динамику развития биоэтики, законодатели стоят перед необходимостью пересмотра существовавших ранее правовых конструкций, а также необходимостью приведения законодательства в соответствие с современными биоэтическими концепциями.

Одной из существующей ключевых проблем, выявленных в рамках настоящего исследования, является проблема неточности определения понятия эвтаназия, под которым в соответствии с положениями ст. 31 Закона Республики Беларусь от 18 июня 1993 г. № 2435-XII «О здравоохранении» (далее – Закон) понимается ускорение по просьбе пациента его смерти какими-либо действиями, бездействием или средствами, в том числе прекращение искусственных мероприятий по поддержанию жизни пациента.